Беларускі Звон

ТЫДНЁВАЯ ЧАСОПІСЬ

АДРЭС РЭДАКЦЫІ І КАНТОРЫ: Вільня, Вострабрамская 9. (Wilno, Ostrobramska 9). АДЧЫНЕНА што дня, апрача сьвят, ад 11 да 2 гадзіны.

Рукапісы павінны быць напісаны чытэльна і толькі на адным баку паперы, з праўдзівым прозьвішчам аўтара і адрэсам (для ведама Рэдакцыі). Непрынятыя у друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукованага залежыць ад Рэдакцыі.

Цана кожнага нумару 30 м. Падпіска на 3 месяцы каштуе 400 м. (з даст. дахаты). Цана абвестак: перад тэкстам 150 мк., сярод тэксту 200 мк і на апошняй страпіцы 70 мк. за радок пэтыту у 1 шпальт

Год II. Вільня, Субота, 4 сакавіка 1922 г. № 6 (31)

Ад Цэнтральнае Беларускае Школьнае Рады.

Гэтым даводзіцца да агульнага ведама, што ў распараджэньні Рады знаходзіцца цэлы рад стыпэндыяў у вышэйшых школах Чэха-Славацкай Рэспублікі для беларускае маладзежы з сярэдняй адукацыяй. Беларусы і беларускі, маючыя атэстаты аб скавчэньні сярэдніх школ могуць зьвяртацца да Рады з просьбай аб прызначэньні ім гэтых стыпэндыяў. Да просьбы павіны быць далажаны дакумэнт аб асьвеце, ці яго нотарыяльная копія і жыцьцярыс — пажадана, каб быў пасьведчаны беларускімі арганізацыямі, ці хоця-б вядомымі дзеячамі. Стыпэндыі перад усім будуць выдавацца асобам, прымаўшым актыўны удзел у нацыянальным жыцьці.

Старшыня Б. Тарашкевіч

Сэкрэтар А. Смоліч

Зьвяртаем увагу шаноўных чытачоў, што рэдакцыя „Беларускага Звону“ перанесена на Вострабрамскую вуліцу № 9.

Дзе выхад?

У працягу апошняга месяца паміж урадамі Літвы і Польшчы адбыўся абмен нотамі ўсе па таму-ж пытаньню аб Віленшчыне, права на якую прэтэндуюць абедзьве стараны, не прызнаючы, разумеецца, права трэцьцяй стараны— Беларусі.

Цікава разгледзіць тыя новыя палажэньні, на якіх сталі Польшча і Літва ў сучасны мамэнт адносна да Віленскага пытаньня.

Але раней, як разьбірацца ў выказаных толькі што Польшчай і Літвой новых палажэньнях, мы пастараемся ўспомніць некаторыя мінулыя факты, датычачыя Віленскага пытаньня.

Па Берасьцейскаму дагавору паміж Савецкай Расеяй і Нямеччынай. Віленшчына (і Горадзеншчына) адыходзіла ад Расеі і Нямеччына пакідала яе (і амаль ня ўсю Горадзеншчыну) Літве.

Аднак, скора пасьля гэтага Нямеччына была пераможана дзяржавамі Антанты і па Вэрсальскаму трактату, падпісанаму Нямеччынай Берасьцейскі дагавор утраціў сваю моц.

Віленшчына, як і ўсе іншыя тэрыторыі, якія адыйшлі ад Расеі па Берасьцейскаму дагавору, асталіся такім чынам, ізноў за Расеяй.

Немцы, дакаціўшыся пад час першых месяцаў бальшавіцкай анархіі ў Расеі аж да Дняпра і Дону, сталі сьпешна ачышчаць занятыя імі тэрыторыі, а за імі ўсьлед ішлі бальшавікі.

Мы добра памятуем, як у пачатку 1919 году бальшавікі прыйшлі і ў Вільню, а потым хацелі йсьці і далей: на Коўну і Варшаву, але затрымаліся і былі потым выбіты з Вільні палякамі.

Пачалася польска-бальшавіцкая вайна.

Палякам спачатку ўдалося заняць значныя тэрыторыі Беларусі (да Бярэзіны і Дняпра) і Украіны (за Кіеў), але скора летам 1920 г. палякі адступілі аж да Варшавы.

Віленшчына перайшла з польскіх у бальшавіцкія рукі,—але так сама не надоўга. На моцы бальшавіцка-літоўскага дагавору, падпісанага ў Маскве 20 ліпня 1920 года, амаль ні ўся Віленшчына і частка Горадзеншчыны адыйшлі да Літвы, з прычыны чаго бальшавікі сталі патроху аддаваць Літве акупаваныя імі літоўскія тэрыторыі, а літоўцы—займаць іх. Было гэта ў працягу верасьня і пачатку кастрычніка 1920 г,

7 кастрычніка 1920 г., ў Сувалках падпісаны быў паміж Польшчай і Літвой дагавор, па якому праводзілася паміж абедзьвума дзяржавамі дэмаркацыйная лінія прыблізна ў напрамку ад Сувалак на Друскенікі, Ліду і Маладэчна, на поўнач ад якой палякі забавязываліся не пераходзіць.

§ 5 гэтага дагавору напісаны так:

„Дагавор гэты астаецца правамоцным аж да мамэнту, калі ўсе спорныя паміж літвінамі і палякамі пытаньні будуць да канца разьвязаны“.

Аднак, ужо 9 кастрычніка, войскі гэн. Жэлігоўскага вайшлі ў Вільню.

Потым, як ведама, пытаньне аб Віленшчыне перайшло ў Лігу Народаў. Першы і другі праэкты Гюманса ня былі прыняты ні Літвою, ні Польшчай, і Л. Н. перастала занімацца Віленскім пытаньнем.

Пасьля гэтага гэн. Жэлігоўскі склікаў у Вільні Сойм, які далучыў ужо Віленшчыну да Польшчы.

І вось цяпер, ужо здаецца, ў трэці раз, ізноў распачаліся беспасрэдныя перагаворы паміж Літвою і Польшчаю ўсе аб тым-жа—аб Віленшчыне.

Апіраючыся на Сувальскі дагавор (§ 5), Літва прапануе Польшчы „*паддацца рашэньню сталага Паміжнароднага Трыбуналу справядлівасьці*“, які павінен вырашыць 1. праўдзівасьць факту зрыву праз Польшчу Сувальскага дагавору 7 кастр. 1920 г. і 2) род і вышыню нагароды за зрыў гэтага дагавору.

У адказ на гэтую прапазыцыю Польскі Урад паведаміў Літоўскі Урад, што ён лічыць літоўскую прапазыцыю не абаснаванаю, пазбаўленаю ў сучасны мамэнт рэальных падвалін і спозьненаю, дзеля таго, што Віленскі Сойм прашуча

Антон Лявіцкі.

(Ядвігін Ш.)

24 лютага ў Вільні памер, на пяцьдзесят шостым годзе жыцьця, адзін з слаўнейшых беларускіх пісьменьнікаў,— Антон Лявіцкі, творы якого друкаваліся пад псэўдонімам Ядвігін Ш. Ен быў між нас апошнім з тых, якія ў найгоршыя часы царскай рэакцыі, многа гадоў таму назад паверылі ў сьветлы ідэал Адраджэньня беларускага народу й панясьлі на яго аўтар і свае здольнасьці, й маладыя сілы, й сваю веду.

Сьмерць А. Лявіцкага ня была для нас неспадзеўкаю. За апошнія годы здароўя пісьменьніка саўсім надламалася й ён хварэў ўсе часьцей і часьцей.

Пісьменьнік радзіўся ў 1866 годзе у двары Карпілаўцы пад Радашкавічамі. Малога хлапца вучыла чытаць і пісаць дачка поэта В. Марцінкевіча. Сярэднюю школу скончыў Лявіцкі ў Менску, а пасьля паехаў у Маскву здабываць вышэйшую асьвету.

У той час, калі паяўлечецца ў Вільні беларуская прэса („Наша Доля“, „Наша Ніва“), Лявіцкі прыязжае ў Вільню і тут супрацоўнічае час ў гэтых часопісях. Пасьля на некаторы час застаецца літэратурным кіраўніком сельска-гаспадарскага месечніка „Саха“ ў Менску.

Як пачалася вайна, Л. пераехаў у сваю родную вёску Карпілаўку. Тут ён папраўляе свае здароўе і вядзе ціхае самотнае жыцьцё. Аднак у той час, калі на небасхіле Бацькаўшчыны на кароткі мамэнт блісвула надзея лепшай будучыны, ён пакідае вёску і прыймае ўчасьце ў грамадзкай і палітычнай працы.

У асобе А. Лявіцкага мы страцілі пісьменьніка, вялікага мастака слова. З маладых гадоў узяўся ён за пяро і цешыў нас сваімі здольнымі апавяданьнямі. Зьмест для іх Лявіцкі бярэ з народнае творчасьці і ў гэтым іх вялікая вартасьць. Яшчэ студэнтам у 90-х гадох перавёў ён на беларускую мову апавяданьне Гаршына „Сыгнал“. З гэтай пары пачынаецца яго літэратурная праца.

Пасьля 1905 году зьяўляюцца кніжкі яго твораў: „Дзед Завала“ (1909 г.); „Бярозка“ (1914 г.). Зборнікі гэтыя зьвяртаюць увагу беларускага грамадзянства і Лявіцкі займае паміж беларускіх пісьменьнікаў пачэснае мейсца

У прыгожым вершыку ў прозе, ахвярованаму памяці С. Палуяну, гаварыць пісьменьнік аб ранах. Найвялікшая боль адчуваецца ад ранаў на душы, гаворыць ён, бо глыбока і балюча нядоляй беларускай ранена была душа яго. Нядоля народа і вялікая любоў да яго адбіваецца ў лепшых творах А. Лявіцкага. Таму апавяданьні яго такія сардэчныя, лёгкія й шчырыя („Гаротная“, „Бярозка“, „Зарабляюць“).

Зачараваны беларускай прыродай ён знайходзіць прыгожыя, ей адной характэрныя рысы, сьвежыя хварбы („Дзед Завала“).

Добры баечнік А. Лявіцкі, заставіў нам таксама цыкл казак-алягорыяў. У гэтых творах ён паказаў нам каштоўныя скарбы беларускага гумару і асьвяжыў занядалую галіну творчасьці („Вучоны бык,“ „Што сказаў певень,“ „Рабы“ і інш.*)

Успамінаюцца яго хаўтуры. За возам з труной ціха йшла грамада людзей. Дзень быў шэры й ветраны. Пад нагамі рыхлы, набухшы, як мокры цукер, сьнег. Зьвінелі і шпарка беглі па вуліцах ручаі. Гэта зямля абуджвалася да нечага новага, пачынаўся веснавы рух. А калі апускалі ў яму труну вецер рваў і кудлачыў валасы сабраўшыхся і грозна трос голымі галінамі дрэваў.

І думалася чамусь, што і там у родных вёсках, якія раскінуты на бязмерным разлогам і загубленых між пушчаў так сама пачынаецца Веснавы Рух і ім пачты і ім творэны... і думалася, што адроджаны народ не бярозцы пойдзе разказваць радасьці свае вясны, бо яму ёсьць да каго прыйсьці й ёсьць каму расказаць іх...

Уладзімер Жылка.

*) Поўны агляд літэратурнай дзейнасьці А. Лявіцкага дамо у чарговым нумары „Бел. Звон

выказаўся за далучэньне *Віленшчыны* да Польшчы.

Што-ж датычыць Сувальскага дагавору, то Польскі Урад глядзіць на яго, як на вайсковы ўклад, які ўстанаўліваў правізорычную дэмаркацыйную лінію паміж двумя арміямі на кароткі час.

Як відаць з выказаных толькі што Літвою і Польшчаю пaглядаў па Віленскаму пытаньню, безпасрэдныя іх перагаворы ні да чаго, вырашаючага справу, ня прывядуць, бо адна старана—Літва—апірае свае палажэньні на дагаворах (літоўска-бальшавіцкім у Маскве і літоўска-польскім у Сувалках), а другая—Польшча—главным чынам на волі насяленьня Віленшчыны, якую быццам, зусім правамоцна выказаў Віленскі Сойм, але ў які, як мы добра ведаем, ніхто апрача палякоў не пайшоў.

Што-ж будзе далей?

Нам здаецца, што трэба-ж такі ў канцы канцоў прызнаць, што небудзь-адно: ці дагаворы маюць моц, ці ня маюць. Напрыклад, Сувальскі дагавор. Якім яго ня лічыць, але-каб з ім перастаць лічыцца зусім, дык трэба было-б яго скасаваць не паходам войска гэн. Жэлігоўскага на Вільню, а новым дагаворам з Літвой.

Гэта адно.

Другое:

А ці пыталіся аб волі насяленьня на тэрыторыях на захад ад Бугу і Нараву (лінія Кэрзона), калі па Рыскаму трактату часьці Беларусі і Украіны аддаваліся Польшчы.

Дык калі станавіцца на грунт „волі насяленьня“, то чаму-ж толькі тады, калі ёсьць хоць слабая надзея „далучыць“, а калі гэтай надзеі няма, то тады, значыць,—няхай жывуць польска-бальшавіцкія дагаворы!

Разумеецца, так быць ня можа, а як будзе,—трудна сказаць.

Цікава, што на прыватнай нарадзе, адбыўшайся гэтымі днямі паміж Л.-Джорджам і Пуанкарэ, пастаноўлена не прызнаваць дагавораў паміж бальшавікамі з аднаго боку і балтыцкімі дзяржавамі і Польшчай з другога боку.

Калі-б такое становішча Л.-Джорджа і Пуанкарэ запанавала на конфэрэнцыі ў Гэнуі, то ў рэшце магло-б прыйсьці да перагляду „расейскаго пытаньня“, а разам з тым і да больш рацыянальнага вырашэньня граніц паасобных народаў, ўваходзіўшых у склад Расеі, з якіх адны—дужэйшыя забралі тэрыторыі, засяленыя іншымі слабейшымі народамі, а гэтыя апошнія нічога не дабіліся, нават роднай маленькай хацінкі на вольнай зямельцы.

Ш—і.

Што чуваць у сьвеце?

Новы кабінэт у Італіі.

Новы кабінэт у Італіі, складзены фактам, падтрымваецца народнай партыяй, дэмакратамі й лібэраламі. Портфэль замежных справаў прыняў Шануар.

Маніфэстацыя безработных у Варшаве.

24 лютага з ініцыятывы Г. Р. S. адбылася маніфэстацыя і сход на тэатральным пляцы з прычын безрабоцьця і 8-мі гадзіннага раб. дня, Дэлегацыя маніфэстантаў была прынята старшынеў Сойму і мін. Стэчкоўскім.

Безрабоцьца у Нямеччыне.

Лік безработных у Нямеччыне павялічыўся да 196 тысячаў чалавек.

Ірляндзія й Англія.

Перагаворы Грыфіта і Дігана з прадстаўнікамі ірляндскага ўраду далі добрыя разультаты. Няма прычынаў да зьмены ангельскай палітыкі да Ірляндыі.

Консульскія зносіны.

Падгатоўчыя работы адносна консульскае згоды Нямеччыны з Сав. Расеяй скончыліся. Перагаворы аб гэтай згодзе вёў у Бэрліне Радэк.

Францускі пасол аб Віленскім пытаньні.

Францускі пасол н. Понафье, на аўдыэнцыі ў Начальніка Дзяржавы далажыў аб тым, як нядобра з міжнароднага пагляду вырашаецца віленскае пытаньне.

Конфэрэнцыя Л. Джоржа з Пуанкарэ.

У Булоні адбылася конфэрэнцыя Л. Джорджа з Пуанкарэ. Конфэрэнцыя цягнулася чатыры гадзіны і дала добрыя вынікі. Прынята шмат важных пастановаў, якія гарантуюць інтарэсы Францыі на гэнуэскай конфэрэнцыі, тэрмін склікацьня якой пераносіцца на 10 красавіка.

Пуанкарэ яшчэ раз перад конфэрэнцыяй ў Гэнуі паедзе да Лёндану

Гэнуэская конфэрэнцыя.

— Італійскі ўрад паведаміў Польшчу, што гэнуэская конфэрэнцыя назначана на 23 сакавіка.

— Чычэрын зьвярнуўся да італійскага ўраду з просьбай забясьпечыць асабістую недатыкальнасьць багажу савецкіх дыпляматаў, што паедуць у Гэную.

— У зьвязку з конфэрэнцыяй у Гэнуі Карпатаруская Рада ў Амэрыцы назначыла на 22 лютага агульны масовы пратэст супроць гвалтаў і зьдзекаў, якія творацца палякамі ў Галічыне, Холмшчыне, Валыні і Беларусі

— Урады рэспублік:—Далёкага Усходу, Азярбейджану, Армэніі, Беларусі і Украіны афіцыяльна зьвярнуліся да маскоўскага савету, просячы яго бараніць іх справы на конфэрэнцыі ў Гэнуі.

— Старшыня італьянскай дэлегацыі на конфэрэнцыю назначан Цітона.

—Амэрыканскія газэты выказваюць надзею, што гэнуэская конфэрэнцыя дасьць добрыя вынікі. Дзякуючы таму, што конфэрэнцыя адложана, Злучныя-Штаты маюць магчымасьць перагледзяць яе праграму і вырашыць аб сваім удзеле.

—Падгатоўчая нарада экспэртаў аб конфэрэнцыі адбудзецца ў Лёндане 3-га сакавіка.

Францыя спагаляе сваё.

Урады Латвіі, Літвы і Эстоніі атрымалі францускую ноту, ў якой Францыя дамагаецца звароту маемасьці, сканфіскаванай у французаў і прыняцьця часьці расейскіх даўгоў.

Грамадзянская вайна.

З Шантунгу паведамляюць, што Кітаю угражаець грамадзянская вайна.

Забастоўка у Партугаліі.

Па ўсяму краю аб'яўлена гэнэральная забастоўка. Прэзыдэнт рэспублікі і старшыня міністраў уцяклі у крэпасьць Бася. Пад Лісабонай групуюцца вялікія вайсковыя сілы;

Конфэрэнцыя Р. Р. S. у Львове.

У Львове адбылася конфэрэнцыя Р. Р. S. Ус. Галіцыі. Прынята рэзалюцыя, якае адкідае праэкт аўтаноміі распрацованы Недзялкоўскім.

Дэмонстрацыя Нью-Іоркскіх украінцаў-галічан.

Некалькі сот украінцаў-галічан, мужчын і кабет, сабраўшыся каля польскага консульства, зрабілі дэманстрацыю пратэсту супроць гвалтаў над украінцамі ў Усх. Галіцыі. Прычынаю да дэмонстрацыі былі весткі аб арыштах палякамі украінскіх дзеячоў, якія пратэставалі проціў пераходу да Польшчы некаторых частак Галіцыі.

(„Утро“ № 2).

100-я ўгодкі латыскай прэсы.

У нядзелю 26 лютага г. г. у Рызе Саюз латыскіх пісьменьнікоў урачыста сьвяткаваў 100-я ўгодкі латыскай прэсы. Першая латыская часопіс вышла

Ідэолёг народнае інтэлігенцыі.

(Максім Гарэцкі).

Літэратурна-соцыяльны нарые.

Народ беларускі, як народ з вельмі прымітыўнай, захаваўшай усю чыстату сваю душой, перажывае ўсе пачуваньні вельмі глыбока і востра, аддаецца і ненавісьці, і любові усей сваей істотай. Але той, хто пераходзіць у стан інтэлігенцкі, той у гэтым ужо непадобен да народу. Гарэцкі вельмі добра прыкмеціў гэта і даў гэтаму мастацкае выражэньне. З гэтага боку заслугуе асаблівае ўвагі галоўнае апавяданьне зборніку „Рунь“ пад тым-жа назовам.

Уладзімір З. піша „да самога сябе“:

„Ад маткі ў песьнях, у казках, у сьлёзах, у стагнаньні; ад бацькі ў рабскай маўклівасьці, у злых славах, у кляцьбе дзяцёнак убіраець у душу ненавісьць да паноў... Ах! Што-б зрабіў ён, сын мужыцкі, ўсім!

„Добра.

„Ты, Уладзька, сын народу. Сколькі ты змалку бедаваў! Сколькі ты ўсякага ліха мысьліў, сколькі краў сэрцам ад зласьлівасьці да паноў!.. Ах, каб меў сілу над панамі! У порах, у пыл!!!...

„Тады шчэ ня чытаў ты кніжак, недалужка Уладзімірка, і не хварэў хваробамі інтэлігента.

„Добра, і вось ты інтэлігент. А! Рука твая не паднімаецца на заклятых ворагаў тваіх! Та баішся дайжа, каб людзі не даведаліся аб думках маленства твайго. Ты пішаш толькі „да самога сябе“. Крый Божа—даведаюцца „інтэлігенты“, што на душы ў цябе! Стыдненька табе! Стыдненька, што ўкрадня ў ночы конікаў вадзіў у панскі лес. Стыдненька, што пакляўся са сьлязамі сам сабе зарэзаць, як вырасьцеш, аб'езчыка за тое, што ня толькі садраў ў ляску хустку ў маткі твае́й за ягады, але і бізуном даў, і гідкім, страшным словам зьняважыў яе, маму, пры табе, дзяцёнку сінявокім“...

Тое-ж, што і з ненавісьцяй, робіцца ў інтэлігента з вёскі і зкаханьнем: яно нейкае мляўкае, няглыбокае. („Красаваў язьмін“, „У чым яго крыўда“), а часамі становіцца нечым чыста скацінным, становіцца прадметам куплі-прадажы, найбольш паганым відам распусты (прыкл. „Мутэрка“,—„Наша Думка 1921). Гэта — агульнае зьявішча.

Вялікая любоў можа нарадзіцца толькі ў вялікай душы, толькі ў душы таго „новага чалавека“, якога Гарэцкі стараецца нарысаваць нам у пастаці таго-ж Уладзіміра З., якога любоў адраджае, падыймае з стану зьнемажэньня, няцікавасьці да жыцьця, зьняверыя ў ідэю і свой народ. У заметках „да самога сябе“ Уладзімір гаворыць аб самагубстве, хоча кінуць усялякую ідэйную працу, піша горкія словы зьняверыя ў беларускай справе. Але вось ён сустракае дзяўчыну—дачку багатых і ганорных паноў, Ядзю, каторая горача палюбіла яго, палюбіла і яго справу, і яго ідэю. Яна, апалячаная ад некалькіх пакаленьняў, ўзгадаваная ў пагардзе да беларускага „мужыцкага“ народу, разам праз любоў адрадзілася і духова, скінуўшы з душы путы становых забабонаў, і нацыянальна, пачуўшы ў сабе кроў дзядоў-беларусаў. І Уладзімір пад гарачым дыханьнем гэтае вялікае любові сам адраджаецца, становіцца запраўды „новым чалавекам“ і разам з Ядзяй кідае родны край, каб недзе за морам долю каваць. „К жыцьцю“!—Вось кліч гэтага „новага чалавека“.

На вялікі жаль, Гарэцкі тут нічога ня кажа аб „новым чалавеку“. Ён толькі падыходзіць да яго, яшчэ сам яго шукае і думае, што Уладзімір —яго ідэал—станецца такім. Але бліжэйшых рысаў яго мы ня бачым: можам толькі дагадацца, што Уладзімір і Ядзя будуць каваць долю ня толькі сабе, але і сваму народу (—хоць і няведама, чаму дзеля гэтага трэба было ўцякаць ажно ў Амэрыку!

Мы зачапілі ўрэшце і беларускую справу,—тую справу, для якой жыве і працуе сам Гарэцкі, якой шчыра аддае свае сілы, свае здольнасьці, свой талент. На ёй, на адносінах да яе мы затрымаемся ў канцы, а цяпер разглядзім два вялікшыя творы Гарэцкага: „Антона“ і „Дьзве душы“.

* * *

Абодва—гэта повесьці. І з гэтага боку яны асабліва для нас цікавы: пад той час, як у дробных апавяданьнях Гарэцкі дае нам паасобныя рысы характару сваіх гэрояў, повесьць павінна абрысаваць суцэльныя тыпы, прадстаўленыя ўсестаронна, павінна вывясьці гэтыя тыпы так, як іх вытварае жыцьцё,—значыць, у прычыннай сувязі з жыцьцёвымі варункамі. У повесьці больш, чым дзе, можа і павінен выявіцца агульны сьветагляд аўтара, яго пагляды і ідэалы—да канца.

„Антон“ напісаны ў пачатку 1914 г., але выпаў з друку ў 1919 годзе. Гэта—гісторыя жыцьця і сьмерці селяніна з глухой вёскі, Антона Жабона, у якім сабраны як-быццам усе містычныя настроі і перажываньні беларускага сялянства. Гэта зборнасьць робіць з Антона тып хваравіты, зусім няздольны да жыцьця і змаганьня за свой быт. Але тып сам па сабе жыцьцёвы, апраўданы варункамі свайго разьвіцьця. Справа ў тым, што бацька Антона, Аўтух Жабон,- гэта адзін з найбольш нягодных тыпаў, якія сустракаюцца ў народзе: тып панскага слугі (ён—лясьнік), каторы крыўдай людзкой выслугоўваецца свайму гаспадару, дый сам таго-ж гаспадара абкрадае. Аўтух —п'яніца, чалавек бяз сумленьня і бяз сэрца. Яго кляне ўся вёска. Усе пагарджаюць ім, адварочваюцца ад яго, як ад ліхога сабакі. І вось сын яго, Антон, узросшы ў такой атмосфэры п'янства, бязглуздасьці і зьдзеку над сваім-жа братам-мужыком, выяўляе сабой поўную процілежнасьць бацьку. Ён—гэта уасабленьне рэакцыі проці ўсіх злачынстваў Аўтуха. Ён змалку дзён хворы на гіпэртрофію, перарост маральнага пачуцьця і рэлігійнасьці. Антон глыбока веручы чалавек, але на кожным кроку ён сустракаецца з недаўменнымі пытаньнямі, якіх ні царква, ні вера ня можа разьвязаць. Ён хоча быць добрым да бацькі, як да таго, хто даў яму жыцьцё і каго царква кажа любіць і шанаваць. Але ў яго душы няма пашаны для нягодніка Аўтуха. І Антон мучыцца гэтым і пачынае прост ненавідзець бацьку свайго. На дабро, на ласкавае слова праведніка-Антона Аўтух адказвае насьмешкамі і зьдзекам. І вось прыходзіць крытычны мамэнт: у царкве на пропаведзі Антон чуе, што дзеці і ўнукі алькаголікаў—гэта людзі, як быццам наперад засуджаныя жыцьцём, што яны ўжо родзяцца няўдалымі і нікчэмнымі, што іх жыцьцё—адна пакута... Яго схапіў жах за сваіх двайга дзетак: гэта-ж унукі Аўтуха—п'яніцы і нягодніка! Значыць, яны, ні ў чым невінаватыя, маюць пакутаваць за грахі дзеда?! Не! Лепей ужо сьмерць, чымся такое жыцьцё! І праведнік Антон даходзіць у сваей багабойнасьці да рэлігійнага ізуверства: ён, каб непамнажаць граху праз дзетак сваіх, перарaзае горла сыну свайму, маленькаму Іваньцы, і сабе самаму. А жонка Антонава, загнаная і забітая цесьцем, ад гора вар'яцеець. Крывавая ахвяра Антона прабудзіла і закамянеўшае ў граху сэрца Аўтуха: ён кідае старое жыцьцё, каецца і з маленькай унучкай-сіроткай ідзе ў старцы, каб замалівацьь свае цяжкія грахі...

У повесьці „Антон“ Гарэцкаму ўдалося вельмі добра нарысаваць тыя варункі, ў якіх жыве беларускі селянін. Рысунак верны, праўдзівы, а ілюзія праўды становіць меру мастацкага пачуцьця аўтара. Добра схарактэрызаваны і адносіны паноў да нашага сялянства: яны ніяк ня могуць убачыць у мужыку чалавека, роўнага ім, здольнага да такіх перажываньняў, якія знаёмы інтэлігенту. І, судзячы з апошніх сцэнак (повесьць напісана часьцю ў форме драматычнага твору), аўтар як быццам паставіў сабе спэцыяльную мэту: паказаць, якія глыбокія, якія зложныя перажываньні гнязьдзяцца часамі пад шэрай сялянскай сьвіткай беларуса.

* * *

Паскольку першая повесьць Гарэцкага раскрывае перад намі толькі адзін бок народнае ду-

Чыя скончылася падпіска й хто не прыслаў падпісных грошаў, таго просім не пазьніцца, каб ня было задзержкі ў высылцы газэты.

студня 1822 г. У дзень сьвяткаваньня была адкрыта выстаўка ў музэі ўсей латыскай прэсы — за гэты час выдадзена колькі сот розных часопісаў. У тэатры адбылося паседжаньне акадэміі, якое распачаў найстарэйшы латыскі журналіст Барона.

(У зьвязку з гэтым сьвятам наша рэдакцыя паслала прадстаўніком латыскай прэсы тэлеграму такога зьместа:

Рэдакцыя „Беларускага Звону" шле братняму Латыскаму Народу гарачы прывет у дзень сьвяткаваньня сталетняга юбілею Латыскае прэсы.

Баларускія журналісты жадаюць сваім латыскім калегам далейшае плоднае працы на карысьць іхняе Бацькаўшчыны, якой яны дагэтуль з чэсьцю пяром сваім служылі.

Ад імя Рэдакцыі: **Францішк Аляхновіч**).

Чарговая справа.

Ад Рэдакцыі. Ня гледзячы на тое, што беларускае арганізованае грамадзянства і беларускія партыі яшчэ ня выявілі свайго становішча у справе ўчасьця у выбарах у варшаўскі Сойм, да якога і гэты кусок нашае Бацькаўшчыны пасьля „wcielenia" будзе мець права слаць пасло ў,— мы даем гэты голас аднаго з нашых працаўнікоў, як матарыял дзеля дыскусіі.

Мы стаім цяперака напярэдадні далучэньня беларускае часьці Віленшчыны або так званае «Сярэдняе Літвы», да Польскага гаспадарства.

Гэтак, дзьве часьціны Заходняе Беларусі, на якія воляй Польшчы і сілай аружжа польскага яна была падзелена, тэй-жа воляй маюць быць ізноў злучаны ў вадно.

Ды не на дабро Беларускаму народу робіцца гэтае далучэньне да Польшчы Беларускае Віленшчыны. Пад уладай Польскага гаспадарства, якое ў сваіх межах бязбожна пазбавіла Беларусаў констытуцыйных свабод, нас жджэ доўгая, цяжкая, упорлівая барацьба за наш быт, за нашае нацыянальнае істнаваньне. І мы ўжо цяпер, загадзя, павінны прыгатаўляцца да гэтага змаганьня. Мы павінны гуртаваць нашы сілы, узмацоўваць нашыя грамадзкія і культурныя установы і арганізацыі, каб у барацьбе за нашы найсьвяцейшыя ідэалы чуць пад сабой моцны, цьвёрды грунт.

Ня гледзячы на ўсю рэакцыйнасьць польскае ўлады, ня гледзячы на тое, што гэная ўлада становіць вернае насьледаваньне маскоўскага „істінно-рускаго" ўраду і прускае гакаты ў адносінах да „інародцаў", мы павінны памятаць, што ў Польшчы ўсё-ж такі істнуе установа, у якой і мы, Беларусы, можам заняць належнае нам месца і бараніць нашага патаптанага права констытуцыйнай дарогай. Гэта — польскі дзяржаўны Сойм. Хоць і тут нашы паслы будуць у такім-жа палажэньні, як у расейскай чацьвертай Думе, усё-ж нам трэба бязумоўна выкарыстаць соймавую трыбуну, каб голасна і яспа — перад усенькім сьветам—высказаць усе нашы крыўды, нашы патрэбы, нашы дамаганьні.

Газэты наказавалі, што цяперашні „установчы" Сойм у Варшаве мае быць да лета распушчаны. Тады ў летку на ўсім абшары Польскае дзяржавы, значыць і ў забранай Польшчай Заходняй Беларусі, адбудуцца выбары паслоў у новы Сойм. Да гэтага мамэнту мы ўжо цяпер павінны прыгатаўляцца: польская рэакцыя, польскі нацыяналізм, маючы ў сваіх руках усю адміністрацыю, жандармэрыю і хмары купленых за грошы агентаў, будуць напружаць усе свае сілы, каб недапусьціць у варшаўскі Сойм ніводнага Беларуса. Выбар запраўдных беларускіх паслоў у Сойм — гэта найвялікшая небясьпека для ўсіх тых, хто гэты край хоча абярнуць у „ісконі-польскую" зямлю.

Дый ня толькі аб гэтым думае польская чорная сотня: яна ведае, што ў самай Польшчы масы працоўнага народу ўжо даўно бурацца проці панаваньня польскага панства і рэакцыйнага чынавенства. Ведаюць, што на грунце выбараў адбудзецца самая вострая барацьба запраўднае польскае дэмакратыі з тымі чорнымі крукамі, якія душаць і нашага селяніна, і польскага рабачая ў роўнай меры. Ведаюць, урэшце, што праўдзівыя выбранцы Беларускага сярмяжнага народу знойдуць супольны язык і супольную дарогу з пасламі польскіх сялян і работнікаў, — і вось яшчэ адна прычына, дзеля каторае польская рэакцыя будзе старацца недапусьціць Беларусаў у варшаўскі Сойм.

Але якраз гэта павінна нам высьніць усю вагу заваяваньня для нашых паслоў месца ў Сойме Польскае Рэчыпосполітае. Усе запраўдныя Беларусы, бяз розьніцы партыі, кірунку і рэлігіі, усе павінны стварыць адзіны, моцны палітычны фронт і дружным напорам разьбіць тую кітайскую сьцяну, якой нашы ворагі хацелі-бы акружыць Беларусаў, каб праз яе ня выбіўся на вольны сьвет голас-стогн уцісканага Беларускага народу!

Ярашэўскі.

Беларусь.

Ідзе ў цьме—ў пакрыўджанай грамадзе. Яднаючы ў паток веснавы дзяцей катаваных рабоў, ідзе праз галовы зьмей, праз ямы, равы, з мальбой і гневам кіпучым, сьвятым.

. . , З пажарышч узнімаецца ахвярны дым.

„Мы доўга цярпелі—цярпець больш ня будзем"...

—Братка, а можа мы блудзім?!

Заскомлілі цені, смоўжы і маскі:— Ай, стойце каравыя хамы! Вы топчаце шчэпы нашы, краскі! Вы глушыце ўрачыстыя гамы у чэсьць сытага супакою!

— О, Божа, не карай нас вайною!

На пралом, наперад ідзе, як крыга па мутнай вадзе. Хвалююцца белыя сьвіткі, змываючы каінаў грэх брыдкі, выкідаючы на бераг трэскі—разьбіткі ад карабля дзяржаўнага ката..'

"Чаму-ж мне ня пець,
„Чаму-ж ня гудзець...

—Ціха ты, квактуха чубата! Бачыш вунь за вуглом цікуецца, адзеўшыся за нашага брата і ўсё з панам таргуецца... і вярзець: "дажджом і мы свайго сьвята".

— Здрада, здрада!

— . . . . !

— Прадажнасьць. Сувязь адступніка-гада з трупам блудніцы прадажнай, родам з шляхты лішне важнай.

Ух, як жа сівер лютуе, як ледзяніць... Няўжо праначуе ён з намі ў труднай дарозе? Няўжо ў трывозе, як у попеле шэрым, згасьне іскра надзеі і веры? Няўжо над кнеямі сьвежымі, над узаранымі межамі будзе каркаць толькі крумкач, будзе на варце стаяць чужак-буржуй?

— Беларусь, ня плач!

— Беларусь, ня журбуй!

Чуеш—твой баян вяшчуе, чуеш— твой Яздак бунтуе вёскі, вёскі, гарады. Дзе шчыт яго чырванее, дык стары там маладзее, а сталеець малады.

„Мы дружна устанем з касамі, сярпамі,
„Прагонім зямлі палачоў...

Устаюць, устаюць, гудуць раямі. Ударнымі хвалямі шыраць круг берагоў: аж за Дзьвінск, за Палескія разлогі, пад Смаленск, пад Буг, руйнуючы астрогі!

Ха-ха ха, а вунь наш прыганяты з воўчым норавам, з доўгімі рукамі, прагавітымі вачамі — пры парозе нашай хаты, нашага [illegible]адня—стаіць вінаваты!

. . . .

О, Беларусь, мая мужыцкая, шматпакутная, непачатая! Зварухніся моц крывіцкая—слава наша ты крылатая.

Беларусь мая юнацкая, шалам дзікая—ўся бунтарская, парві пута ты чужацкае—будзь дзяржаўная, гаспадарская!

Беларусь мая несьмяротная, кветка белая, маці родная, ўсей істотай сваей табе шчасьце хачу, аб ім сьню, лятучу —на дне бур, між віхроў ўсё шукаю...
Не найду. Не прычакаю.—
Я згару ў барацьбе.

Эй, зайздруй маей судзьбе!

Сучасны.

шы: яе містычныя перажываньні, пастольку другая — „Дзьве Душы," якая выйшла ў сьвет цераз два гады пасьля „Антона" (ў 1920 годзе), уваходзіць у другую сфэру жыцьця: нацыянальна-грамадзкую.

Самая завязка повесьці — гэта дужа цікаўная проблема, хоць наагул у літэратуры ня новая. Мамка-сялянка, кормячы ў двары панскае дзіця, хоча даць свайму роднаму сыну „шчасьлівую" будучыну, замяняе ў калысцы дзяцей, і гэтак сялянскі сын узгадоўваецца на „пана," пад той час, як паніч расьце на „мужыка." Якая цікаўная і ўдзячная задача для аўтара: прасачыць, як адаб'ецца на душах абодвух дзяцей перамена іх соцыяльнага палажэньня, якія плады дадуць асаблівыя зачаткі іх духовага ўкладу на чужой глебе? Аднак, гэту проблему Гарэцкі развязавае толькі напалавіну: ён аналізуе і абрысоўвае больш выразнымі штрыхамі толькі „мужыка ў панох," Абдзіраловіча, прапускаючы гэткую добрую магчымасьць разьвінуць псыхолёгію Васіля— „пана ў мужыкох," і абмежаваецца адно некалькімі мамэнтамі.

„Дьве душы," аб якіх чытаем у загалоўку кніжкі,—гэта „двудушнасьць" галоўнага гэроя повесьці, Абдзіраловіча. Узгадаваны на „пана" вясковы хлопец ня можа знайсьці цьвёрдага грунту, на каторым мог-бы стануць. Яго прыцягавае да сябе і ўсенародны выбух рэвалюцыі — барацьба за волю тых мас, з якімі ён зьвязаны крывёй, хоць спачатку сам аб тым ня ведае; прыцягаваюць і белагвардзейцы з такімі страшэнна сільнымі, але панурымі і агіднымі тыпамі, як Гарэшка, — і буржуазнае грамадзянства з такімі праўдзівымі красачкамі, як Аля, ды з усімі сваімі хібамі і недахваткамі, лішне добра вядомымі Абдзіраловічу. Але ні на адзін, ні на другі бок ён „самавызначыцца" ня можа: ён так духова расхлябаны, што ня мае ні сілы, ні ахвоты зрабіць нейкі выбар. Ня можа яго захапіць да канца й той новы элемэнт дэмакратычнага, народнага руху, які становіць беларускае нацыянальнае адраджэньне, — хаця аўтар прымушае ўвесь час ждаць якогась пералому ў нацыянальным кірунку (думкі ў дарозе едучы на вёску.) Да такога пералому Абдзіраловіч не дайшоў, і, ня гледзячы на ўсю тую завіруху, ў якой ён жыве, ня гледзячы на прызывы і крыві, і ўсіх лепшых элемэнтаў, з якімі яму даводзіцца сустракацца, і так мілай яму дзяўчыны (Іра), ён так і астаецца да канца чалавекам калекім, расхлябаным, нікчэмным, ня маючы пад сабой ніякага грунту ні ідэі. Сам аўтар на апошніх страніцах дае яму суровы прысуд вустамі вучня-агітатара Сухавея (ў гутарцы з вучыцелькай Ірай). „Што? ён казаў вам, што мае „дзьве душы"?.. І вы яго бароніце? Дарма! Гэта ня „дзьве душы", а гэта... гэта... гэта расхрыстанасьць, разьлезласьць, мякацеласьць... нешта для мяне гідкае, сьлізкае. Гэтыя выродкі губяць Бацькаўшчыну, як і ўсякія ворагі-чужынцы... Эт, дрэнь"... Нават прызнаньне паміраючай мамкі, што ён—ня панскі сын, а яе роднае дзіця, ня здолела вывясьці гэроя повесьці з апатычнага, як-быццам вэгетацыйнага стану. Разьвязка проблемы прышчэпкі „мужыцкага" дзічка на „панскім" дрэве больш чым ясная: гвалтоўна-адарваная ад „роднага караня" душа Абдзіраловіча абязсілела ад „інтэлігенцкіх хваробаў", і —дзічок завяў.

Побач з ідэйнымі блуканьнямі галоўнага свайго гэроя Гарэцкі дае абразы жыцьця краю ў той час, як валіліся фундамэнты старое Расеі, і падыходзіць да тых сяўцоў беларускае нацыянальнае ідэі, што для яе аддаюць усе свае сілы, сваё шчасьце, сваю волю. І Мікола Канцавы, і горы-гарэцкі вучань-агітатар Сухавей, і вучыцелька Іра Саковічанка—гэта зусім жывыя, здаровыя і затым такія сьветлыя, такія мілыя тыпы, што міма-волі вызываюць шчыры спогад іх перажываньням, іх гору і працы. Яны—антытэза духоўна калекаму Абдзіраловічу; яны нясуць той штандар, на службу катораму аўтар дарэмна заклікае Абдзіраловіча. Яны—гэта сіла і будучына народу, запаведзь «новага чалавека». Яны ні перад чым не затрымаюцца і дойдуць туды, куды рвуцца ўсімі сіламі сваей душы! На іх з такой шчырай прыемнасьцю затрымліваецца думка і як-быццам купаецца ў чыстай, халоднай крыніцы!...

Повесьць Гарэцкага, ня гледзячы на яе даволі сур'ёзныя недахваткі, цікавая галоўным чынам як адбіцьцё беларускага жыцьця ў пачатку бальшавіцкага перавароту. Яна першы раз раскрывае багацьце гэтага жыцьця, раскрывае духовае хараство барцоў за беларускую нацыянальную ідэю, аб каторых шырэйшае грамадзянства йшчэ так страшэнна мала ведае і мо' так-жа мала іх цэніць...

* * *

Хаця пасьля повесьці „Дзьве Душы" Гарэцкі напісаў яшчэ шмат апавяданьняў, ён у іх, прынамся ў тых, якія нам ведамы, бадай-што нічога новага ня ўнёс. І можам на гэтым закончыць агляд яго твораў і перайсьці да таго пытаньня, якое мы раней толькі мімаходам закранулі: да пытаньня нацыянальнага.

Беларуская нацыянальная справа, справа нацыянальнага адраджэньня беларускага народу — гэта найважнейшы догмат грамадзкае рэлігіі Гарэцкага. Мы ўжо бачылі, як у асобе гэрояў дробных апавяданьняў Гарэцкі падыходзіў да гэтага пытаньня; мы бачылі, якімі незвычайна сьветлымі выходзяць у яго тыпы байцоў за беларускую справу ў яго „Дзьвюх Душах". Мы бачылі ўрэшце, што Абдзіраловіч, якому жыцьцё давала вельмі шырокі прастор да творчае працы, гібее, як нешта лішняе, непатрэбнае, бо не даецпеў да ўразуменьня беларускае ідэі, бо не здалеў захапіцца ею. А побач Антон Жабон, які ўзьбіўся на аднабокі, няжыцьцёвы шлях містыцызму, плоціць за гэта сваёй крывёй і крывёй свайго сына. І мы бачылі, што той, хто, паводле Гарэцкага, можа стацца „новым чалавекам",—Уладзімір З.,— у аснову свайго адноўленага жыцьця кладзе працу для беларускай справы. Ідэя аб „новым чалавеку" і аб справе беларускай у Гарэцкага зьліваюцца у вадно. І гэта, бадай, адзіная конкрэтная рыса, якой наш пісьменьнік надзяляе свайго „новага чалавека": побач з клічам „к жыцьцю!"—гэта вычэрпывае ўсю концэпцыю „новага чалавека". Тыпы Гарэцкага, якія запраўды падбліжаюцца да „новага чалавека", заўсёды ледзьве-ледзьве абрысаваны некалькімі штрыхамі. Паўторым: Гарэцкі шукае „новага чалавека" толькі нашчупавае яго, але да яснага прадстаўленьня аб ім дагэтуль не дайшоў. Паадзінокія рысы не даюць цэласьці—сынтэзы „новага чалавека".

Тут гожа адзначыць, што сувязь паміж беларускай ідэяй і ідэяй «новага чалавека» ў Гарэцкага не прыпадковая. Гарэцкі сам вырастаў духова адначасна з ростам у яго душы нацыянальнае сьвядомасьці. Ен, як сам кажа, усьвядаміўся самастойна, разьвіўшы падсьвядомае пачуцьцё сваей нацыянальнай прыналежнасьці (бо яно бязумоўна было падсьвядомым у часе дэклямаваньня «Тараса на Парнасе» і ўжываньня „мужыцкае" мовы) да поўнага ўразуменьня ідэі і актыўнай працы для яе. Праходзячы ўсе этапы культурнага росту, Гарэцкі разам з тым перажыў і ўсе этапы разьвіцьця беларускае ідэі.

Але рост духовае культуры не канчаецца з уяўленьнем сабе нацыянальнае, ці якое іншае вялікае ідэі. І сам Гарэцкі, а з ім і яго гэроі, будуць яшчэ далей расьці і разьвівацца духова, хоць беларускай ідэяй яны праняліся да канца, хоць мо' ў ёй ужо мала для сябе новага здалеюць выкрыць. Бязумоўна, да „новага чалавека" дарога йдзе праз паглыбленьне свайго духовага Я, праз узбагачаваньне сваей душы. А з скарбаў ДУХА, калі не нарадзіўся, дык народзіцца і шуканы Гарэцкім, дый не адным толькі ім, запраўды новы чалавек беларус, аблічча якога знойдзе закончаны абраз у творах нашых мастакоў слова.

Антон Навіна.

Вільня, 25. XII. 1921

Літоўскія справы.

— Літоўскі урад зьбірае матэрыялы, якія сьведчуць аб няправільнай дзейнасьці палякоў у часы выбараў у Віленскі Сойм.

— Літоўскі Урад выдаў новы зямельны закон, які устанаўлівае найбольшую зямельную уласьнасьць 150 гэктараў.

— Новы кабінэт Гальванаускаса разглядаў праект прапазыцыі да польскага грамадзянства у Літве, з мэтай стварэньня народнай рады на культурна-асьвятовому пытаньню. На выпадак згоды палякоў літоўскі урад створыць міністэрства польскіх справаў.

— Літоўскі міністр замежных справаў разаслаў цыркуляр да ўсіх літоўскіх прадстаўнікоў заграніцай, з пытаньнем, што яны зрабілі у тых краёх, дзе яны зьяўляюцца прадстаўнікамі ад Літвы, ў справе звароту высланых вільнян.

З прэсы.

Водгукі віленскіх выбараў.

Вялікая Нью-Іоркская газэта „Утро" у № 11 пасьвячае перадавую стацьцю Віленскім выбарам. Газэта добра паінфармавана аб краёвых справах. Стацьця канчаецца такімі радкамі:

„Польскі Урад вядзе далей сваю прымусовую палітыку што да прылучэньня чужых і варожых Польшчы зямель. Паневяраецца воля народаў. Польская палітыка абурае ня толькі жыхароў забраных сілком зямель, але і ўвесь культурны сьвет. Тут у Амэрыцы, дзе шмат жывець выхадцаў беларусаў з Віленшчыны, гэтая крыўда і боль чуецца асабліва востра.

Мы думаем, што за гэтакую нясумленную палітыку Польскі Урад панясе належную кару. Польскі дзяржаўны крэдыт знаходзіцца ў крытычным становішчы і не дарма амэрыканскія банкіры катэгорычна адказываюцца падтрымаць Польскі Урад крэдытам".

Віленскі Саюз Каапэратываў і беларусы.

На нядаўна быўшым зьезьдзе паўнамоцнікаў Віленскага Саюзу Каапэратываў, замест падаўшайся у адстаўку Управы Саюзу, была выбрана Управа з трох асоб: Красноўскі (беларус), Платакіс (літвін) і Пяткевіч (паляк); і два кандыдаты: Мілайкоўскі (жыд) і Вялецкі (літвін). Такім чынам з пяці выбраных аказаўся толькі адзін беларус, хоць на зьездзе была відочная большасьць беларусаў.

У новай Управе Красноўскі быў выбраны Старшынёй, але яго становішча было дужа цяжкое, бо літвін—Платакіс найчасьцей падтрымліваў прапазыцыі п. Пяткевіча, і Красноўскі аставаўся часта у меньшасьці. Найглыбшая нязгоднасьць у паглядах зазначылася ў пытаньні аб скарачэньні ліку інструктароў. Тады як Красноўскі быў таго пагляду, што зьменшыць інструктароў—гэта скараціць каапэрацыю у Саюзе Каапэратываў, што яны асабліва патрэбны цяпер, калі трэба ўсім Таварыствам дапамагчы зрабіць гадовыя справаздачы за прайшоўшы год,—п. Пяткевіч і п. Платакіс былі адменнага пагляду. Часова спрэчку спыніла... жандармэрыя, арыштаваўшы 23 студня Старшыню Управы Саюзу п. Красноўскага.

Пасьля арышту Красноўскага, ў складзе Управы Саюзу і сярод кандыдатаў не засталося ніводнага беларуса.

Пабачым, як прадстаўнікі іншых нацыяў павядуць справу у Віленскім Саюзе. Дагэтуль гаварылі, што ў быўшых Управах Саюзу была большасьць і панаваньне беларусаў, але-ж Саюз, як мы бачым, разьвіўся і мае добрае імя сярод шырокіх кругоў сялянскіх масаў.

Чэсьць і слава была-б тым прадстаўнікам, якія цяпер у Управе Саюзу, калі-б яны давялі Саюз да таго стану, які ён меў хоць бы у лістападзе 1921 г. (да заходу польскіх шовіністаў, пад правадырствам, прыехаўшага з Варшавы, пана Вольскага).

Пабачым...

Менчук

КАРЭСПАНДЭНЦЫІ.

Браслаў, Браслаўскага пав.

Тутэйшы сьвяшчэнік а. Васілеўскі прасіў у гміннай рады дазволу на адкрыцьцё пры царкве расейскай школы. Яму ў гэтым адказалі, ды дазволілі адчыніць беларускую школу. Але а. Васілеўскі дагэтага часу ўсё марудзіць і трымае дазвол у кішані. Даволі, бацюшка, марыць аб даўнейшым. Пара зьвярнуцца да Бел. Школьнай Рады (Вільня, Віленская 12) і папрасіць добрага настаўніка ды распачаць з ім беларускую культурную работу, папраўдзе карысную для народа.

Гаспадар з пад В і ц.

Опса, Браслаўскага пав.

У нашай вокрузе ўжо будзе з паўгода як працуе бюро па адбудове краю. Складаецца яно з пяці чалавек, а дзеля перавозкі матэрыялу мае двое коняў. На чале гэтай, дужа карыснай, арганізацыі стаіць інжынэр Розэн. Будаўнічы талент п. інжынэра скірованы ў бок самых пільных патрэб сялянства. Бо калі яны жывуць, то і працуюць, а калі працуюць, то і ядуць, а калі працуюць і ядуць, то павінны мець такі ці іншы адпачынак. І вось дзеля адпачынку за гэты час п. інжынэр пабудаваў тры патрэбных каморкі: адну ў Браславе, як кажуць людзі, якім няма чаго рабіць дзеля п. Старасты, а дзьве ў нашай Браслаўскай Опсе. Але з гэтымі дзьвумя апошнімі каморкамі выходзіць настаяшчы кур'ёз. Якімі мэтамі карыстаўся п. інжынэр, выбіраючы мейсцы дзеля гэткіх будынін, нікому не вядома, але досыць таго, што адну пабудаваў па дарозе з касьцёла да могілак, якую па жалабе тутэйшых жыхароў, павінен знесьці і выбраць болей адпаведнае і належнае месца. А другую пабудаваў, як ня сьмешна, на школьнай студні, вадой з якой карысталася, бадай што поўмястэчка. Многа чаго можна б сказаць аб працы п. інжынэра, але на гэты раз досыць.

Опсец.

М. Вішнево, Валожынскага пав.

На падставе пасьведчаньня, выданнага Краёвай Сувязьзю ў Вільні, ў мястэчку Вішнево, Валожынскага павету, была адчынена з 20-га студня г. г. беларуская пачатковая школа, якую мяйсцовая міліцыя 7 гэтага лютага зачыніла.

Матывы зачыненьня школы такія, што няма на руках у вучыцеля пазваленьня пана куратора, ў газэтах: „Раніца" і Еднасьць" было надрукована, што Вішнеўская школа зацьверджана панам куратарам, як прыватная школа, але ў хуткім часе будзець прынята на ўрадовы кошт.

Такім чынам, ня стала ў Вішневе беларускае школы, якой бацькі й дзеткі чакалі доўгі-доўгі час.

Вось, як добра жывецца беларусам.

Дзед Беларус.

м. Мір, Нясьвіжскага пав.

У нас з'арганізваўся беларускі культурна-прасьветны гурток, збіраемся скора падаць на зацьверджаньне статут гуртка. На чале гуртка стаіць паважаны гр. Уладзімер Лабоцкі.

12 лютага ў нас адбыўся першы за апошнія часы беларускі вечар. Ставілася «Атрута» М. Гарэцкага і „Зьбянтэжаны Саўка" А. Родзевіча,—Зацікаўленнасьць сярод жыхароў аграмадная. Чысты даход пайшоў на культурна прасьветныя мэты — арганізаваньне беларускае бібліатэкі. Калі мы йзноў зьвярнуліся да п. Старасты Чарноцкага аб дазваленьні на другі вечар, дык нам адмовіў па тэй прычыне, што наш Гурток не легалізованы і ня мае статута, хоць, жа першы раз і без статута дазволілі. — Шкада што апошнія часы ніводная беларуская газэта да нас не дайходзіць.

Усе чэсныя грамядзяне і шчырыя сыны нашай бацькаўшчыны нашае вокругі з болем у сэрцы пачулі аб арыштах нашых правадыроў і высылцы іх за межы свае Бацькаўшчыны. Мы пэўны, што праўда прыдзе к нам і запануе лепшае жыцьце.

Тутэйшы.

Горадня.

— У Горадні адчынена беларускае т-во дапамогі ахвярам вайны.

— У хуткім часе мае выйсьці беларуская тыднёвая газэта „Гаспадар".

— Беларускае грамадзянства ў апошнія часы пачало паважна думаць аб тым, каб атрымаць у праваслаўнага япіскапа права на царкву Барыса і Глеба, ў якой казаньні гаварыліся-б у беларускай мове.

Калі-б царквы не ўдалося атрымаць, дык будуць клапаціцца каб казаньні гаварыліся пабеларуску ў саборы.

Есьць надзея, што япіскап дасьць згоду. У гэтай справе напісана спэцыяльная заява і ўжо сабрана шмат подпісаў. Грамадзянства беларускае ўпаўнаважыла гр. Баранава весьці гэту справу.

Гаротны.

— Польская адміністрацыя ў Горадні ўсялякімі магчымымі і немагчымымі спосабамі стараецца задушыць беларускі рух. За апошні год разагнала Беларускі Нацыянальны Камітэт, Беларускую Грамаду Моладзі, зачыніла 17 каапэратываў, Беларускую Гімназію, штодзенную газэту „Беларускае Слова", а Горадзенскі Староста, тайным цыркулярам да пачтовых установ, аб'явіў усю беларускую прэсу нелегальнай. Цыркуляр гэты выявіўся ў Акружным Судзе, калі судзілі 27 студня г. г. тутэйшага беларускага дзеяча Кузняцова-Курбскага за перахаваньне беларускай газэты „Крупіса". Маючы на ўвазе вышэйсказанае і перажываючы нескончоныя вобыскі і арэшты мы, беларусы, пазбаўлены закона, былі пераконаны, што грам. Курбскага строга засудзяць. Толькі дзякуючы энэргічнай абароне адваката-паляка п. Язэпа Домброва, гр. Курбскага, прасядзеўшага 5 месяцаў, апраўдалі.

Горадзенскія беларусы падалі п. Я. Дамброву пісьменную падзяку гэткага зьместу:

Паважаны Пане Домброва!

Мы ніжэйпадпісаныя беларусы, прысутныя пры разбору справы Курбскага ў Акружным Судзе 27-га студня г. г., прыносім Вам шчырае „дзякуй" за выдатна-здольнае і справядлівае высьвятленьне здраднай дейнасьці цёмных элемэнтаў польскага грамадзянства, каторыя ўсілуюць сеяць, як мага, больш раздор паміж польскім і беларускім народамі і дзеля гэтага інсцэніруюць працэсы, падобныя справе Курбскага.

У цяперашнюю цяжкую для беларускага нацыянальнага жыцьця пару, пасьля поўнага задушэньня беларускага друкаванага слова, вельмі прыемна было пачуць, што ёсьць сярод польскай інтэлігенцыі людзі, каторыя могуць падняцца над душнай атмасфэрай злоснага шовінізму. Гэта змацовывае нашу веру, што калісь прыйдзе пара рэалізацыі вялікага лёзунгу: „Вольныя з вольнымі, роўныя з роўнымі".

Шчыра дзякуем за гэту Вашу працу ў дзеле барацьбы справядлівасьці проці нацыянальнага зьдзеку".

(Подпісы.)

Антон з Рубежа

м. Вязынь Вялейскага пав.

У нас у кожнай вёсцы павінна быць варта ня толькі ноччу, але і ў дзень. Для чаго—няма ведама. Праз вёску Радзькевічы, варочаючыся з Вялейкі ў Ільлю ехаў пан начальнік 3 раёну ды і агледзіўся, што ня відаць варты. Гэта было ў 4 гадзіне па паўдні. Зараз дазнаў, што вартаваць павінны былі ўдава М. П. і жыхар П. Ж. На мейсцы ён аштрафаваў іх абаіх на 5,000 мар. але-ж пасьля пераменіў гнеў на міласьць і першай саўсім дараваў, а апошняму збавіў да 1000 мар. Тут трэба сказаць, што варта ў нас гэта ёсьць спосаб, каб зьдзекавацца над чалавекам. Калі вясковы солтыс да каго з суседзяў, што колячы мае, дык ловіць яго на „варце". Паліцыянт, выбіўшыся з работы, едзе ноччу правераць варту. Надоячы быў такі выпадак. Войт гміны п. Юрэвіч, каторы, праўду сказаць, надта любіць выпіць, узяўшы стайкавога, жыхара вёскі Чэхі, паехаў ў Радашкавічы. Заехаўшы туды купіў там чагось трохі, выпілі па звычаю з хурманом і паехалі назад. Дарогай конь спудзіўся і паляцеў, і тут пан войт згубіў ўсё тое, што купіў. Каб хоць трохі вярнуць згубу ён кажа свайму хурману, каб ён яго, войта, лічыў за сышчыка, дзе гэта трэба будзе, і гэтак згаварыўшыся паехалі. ў вёску Пінчукі праверась варту. Вясковыя ня знаюць хто гэта і пытаюцца ў хурмана, а хурман кажа, што «сышчык», перапужаныя сяляне мусілі дзела кончыць палюбоўна. Паехаўшы далей заехаліся ў другую вёску Баравая; там гэта-ж самая. І там канчаюць справу палюбоўна. Яны паехалі далей, лічачы даход і заехаліся ў вёску Рабчанка і давай пячы там тое сала, якое выжабравалі правяраючы варту, а тым часам там дазналіся, што гэта ня сышчык, а войт гміны Вязынскай, селі на коні і давай даганяць гэтага „сышчыка". Што-б там было няведама, але шчасьце яго ў тым, што ён зьвярнуў з дарогі і астанавіўся ў в. Рабчанцы. Цяпер, як чуваць, тыя падаюць жалабу. Праўду сказаць, наш гэты войт і яго сакратар п. Грыневіч такім дзелам часта заняты.

С. Саха.

Беларуская хроніка.

Хаўтуры А. Лявіцкага.

27 лютага раніцай пасьля хаўтурнага набажэнства ў касьцёле сьв. Мікалая, якое адправіў кс. Бобіч, закончыўшы прамовай аб дзеяльнасьці нябошчыка выйшла пахаронная працэсыя на могілкі „Росса". У перадзі йшлі дзеці беларускага прытулку і вучні беларускае гімназіі, якія пялі: „Божа, што калісь народы", далей—беларускія студэнткі несьлі вянкі з істужкамі нацыянальных колераў ад Школьнае Рады, ад беларускага студэнцтва, ад калег супрацоўнікаў. За дамавінай ішло шмат беларускай інтэлігенцыі.

На могілках прамаўлялі: ад імя Т-ва беларускай школы—грам. А. Смоліч, ад студэнцкай моладзі—студ. Абрамовіч і ад беларускіх пісьменьнікаў—рэдактар „Белар. Звону" Ф. Аляхновіч.

Лекцыя Б. Тарашкевіча.

— У суботу 4 сакавіка у Бел. Музык. драмат. Гуртке (Біскупская 12) п. Б. Тарашкевіч прачытае лекцыю на тэму «Пытаньне аб пачатку беларускай народнасьці у сучаснай навуцэ».

Пачатак а 7 гадз. у вечары. Уваходны білет каштуе 100 мар.

Новая кніжка Я. Купалы.

Як мы даведаліся ў хуткім часе ў Бэрліне мае выйсьці з друку збор. новых твораў Я. Купалы «Спадчына». Гэта будзе багаты уклад у нашую літэратуру.

У Бел. Жан. Гуртку.

Запісы ў Гурток Беларускіх кабет прыймаюцца ў памяшканьні Нацыянальнага Камітэту ад 12 да 2 гадз. Узнос аднаразовы 300 мк. і што месяц 100 м.

Беларускі гуртуйцеся і сьпяшайцеся запісывацца.

Віленскае жыцьце.

Зьмена у Часова Урадуючай Камісіі.

З прычыны таго, што п. А. Мэйштовіч пакідае сваё становішча прадседацеля Ч. У. К. дык, згодна дакрэта № 413, ўсе справы пераходзяць пад загад віцэ-прадседацеля Ч. У. К., якім і зьяўляецца гэнерал С. Макржэцкі.

Жарты.

Палітыка на Беларусі.

У густым змроку палітычнай завірухі чуюцца галасы:

І-шы голас: Янэк, Янэк, я кажух рашоў!

ІІ-гі голас: Нясі яго сюды.

І-шы голас: Але ў ім чалавек сядзіць!

ІІ-гі голас: Вытрасі яго.

Жук.

Паштовая скрынка.

У в. Барсукі. Б. Лярсону. Газэта Вам выслана, Беларускі календар на 1922 г. вышаў. Сьпісак беларускіх кніг можна дастаць толькі ў кнігарні ў Вільні Завальная вул. № 7.

Падп. І. Юпку. Газэта Вам высылаецца акуратна. Запытайцеся на пошце.

Рэдактар-Выдавец ФРАНЦІШАК АЛЯХНОВІЧ.

Друкарня „Друк" Субач, 2.